# ВОДЗЫЎ

аб аўтарэфераце дысертацыі Панова Сяргея Веніямінавіча «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь», прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі

Абраная саіскальнікам тэма дысертацыі ўяўляе навуковую цікавасць як гісторыка-педагагічнае даследаванне, прысвечанае гісторыі адукацыі, што комплексна закранае гістарычную і педагагічную галіну ведаў. Відавочная міждысцыплінарнасць абранай саіскальнікам тэмы даследавання праяўляецца праз пазіцыяніраванне школьнай гістарычнай адукацыі як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы і як сацыягуманітарнай з’явы.

Абгрунтаванне саіскальнікам вызначаных ім у якасці мэты даследавання канцэптуальных асноў школьнай гістарычнай адукацыі як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы прадстаўляецца праз змены ў мэтавызначэнні, прынцыпах абнаўлення і адбору зместу, яго структураванні з улікам лінейнага і канцэнтрычнага падыходаў на ўсіх трох ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, у тым ліку на ўзроўні пачатковай школы. Даследаванне школьнай гістарычнай адукацыі як сацыягуманітарнай з’явы адлюстравана праз характарыстыку прадстаўленых у навукова-педагагічным супольніцтве Беларусі канцэптаў гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства.

У змесце аўтарэферата ахарактарызавана дзяржаўная гістарычная палітыка ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, што з’яўляецца спецыфікай прадстаўленага ў аўтарэфераце гісторыка-педагагічнага даследавання, а таксама і яго навуковай навізной.

Актуальнасць тэмы дысертацыі абумоўлена наспеўшай неабходнасцю даследавання працэсу станаўлення і развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, пачынаючы з 1991 г., ва ўмовах ажыццяўлення дзяржаўнай гістарычнай палітыкі, накіраванай у адпаведнасці з Канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (2010) на замацаванне ў Беларусі беларускай нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага мінулага і беларускай мадэлі гістарычнай памяці.

Яскравым сведчаннем значнасці даследавання з’яўляецца вызначэнне саіскальнікам перспектыў развіцця школьнай гістарычнай адукацыі пры трансляцыі яе зместу як гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі ў працэсе фарміравання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці вучняў.

Значнасць тэмы даследавання відавочна ў працэсе рэалізацыі Праграмы патрыятычнага выхавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2022–2025 гг. сродкамі школьнай гістарычнай адукацыі, якія накіраваны на ажыццяўленне яе светапоглядна-выхаваўчай функцыі з улікам сацыяльна-педагагічнай мадэлі патрыятычнага выхавання вучнёўскай моладзі, распрацаванай з удзелам саіскальніка.

Прадстаўленая ў аўтарэфераце структура даследавання лагічная і адпавядае логіцы пазіцыяніравання школьнай гістарычнай адукацыі як шматкампанентнай і шматфактарнай педагагічнай сістэмы. Вывучэнне дадзенай сістэмы абумоўлена яго міжідысцыплінарнасцю, якая ўлічвае метадалагічныя асаблівасці гісторыі адукацыі (педагагічнасць, гістарычнасць, культуралагічнасць, сацыялагічнасць, паліталагічнасць, антрапалагічнасць, філасафічнасць); метадалагічныя прынцыпы гістарычнага пазнання (навуковасць, гістарызм, аб'ектыўнасць, прычыннаабумоўленасць, сістэмнасць, альтэрнатыўнасць, лагічнае абгрунтаванне, гуманізм, шматфактарнасць); метадалагічныя падыходы акадэмічнай гістарычнай навукі (фармацыйны, мадэрнізацыйны, цывілізацыйны); прадметна-гістарычныя падыходы (гісторыка-крыніцазнаўчы, гісторыка-антрапалагічны, гісторыка-аксіялагічны); агульнапедагагічныя (культуралагічны ў пераемнасці з кампетэнтнасным).

Саіскальнікам, зыходзячы са зместу аўтарэферата, удакладнены канцэптуальна-метадалагічны, інстытуцыянальна-функцыянальны, зместава-дзейнасны, сацыяльна-аксіялагічны кампаненты школьнай гістарычнай адукацыі ў адпаведнасці з вызначальнымі фактарамі. Сярод такіх фактараў саіскальнікам раскрыты канцэптуальныя асновы школьнай гістарычнай адукацыі ў трох пакаленнях канцэпцый 1991, 2009, 2022 гг.; афармленне дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь; рэалізацыя нацыястваральнага патэнцыялу гісторыяй Беларусі; трансляцыя зместу адукацыі як сацыяльнага вопыту ва ўмовах сучаснай міжпакаленнай камунікацыі пры забеспячэнні пераемнасці гістарычнай памяці і сістэмы традыцыйных каштоўнасцей.

У адпаведнасці з вышэйабазначанымі фактарамі саіскальнікам распрацавана і абгрунтавана перыядызацыя развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, якая мае комплексны характар. Дадзеная перыядызацыя таксама ўлічвае стандартызацыю ў трох пакаленнях адукацыйных стандартаў 1998, 2009, 2018 гг.; структураванне зместу адукацыі па канцэнтрычных і лінейных прынцыпах; канструяванне зместу ў пяці пакаленнях школьнай вучэбнай гістарычнай літаратуры. У якасці заўвагі, якая мае рэкамендацыйны характар, можна абазначыць дастаткова намінатыўнае абазначэнне працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў 2023–2024 гг., звязанае з рэалізацыяй Канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, адобранай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 2022 г.

Абгрунтаванасць і дакладнасць вынікаў дысертацыі забяспечваецца ўвядзеннем у навуковы ўжытак значнай інфармацыі з фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, комплексам навукова-даследчых работ з удзелам саіскальніка, практычнай рэалізацый вынікаў даследавання ў рэгіянальных інстытутах развіцця адукацыі на курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў гісторыі, непасрэдным удзелам саіскальніка ў распрацоўцы Канцэпцыі «Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі» (2009) і Канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь (2022), стварэннем

саіскальнікам як сааўтарам некалькіх пакаленняў грыфаваных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь вучэбных дапаможнікаў па сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі, прадмеце «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь».

Варта адзначыць сацыяльную значнасць вынікаў дысертацыйнага даследавання, звязаную з фарміраваннем у вучняў гістарычнай памяці і нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці як інтэграваных характарыстык асобы, якія абумоўлены рэалізацыяй канцэпту беларускай дзяржаўнасці ў яе гістарычных і нацыянальных формах, прыняццем вучнямі каштоўнасці дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і сістэмы традыцыйных каштоўнасцей беларускага народа як рэгулятараў сацыяльных паводзін.

Афармленне дысертацыі адпавядае патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў.

Азнаямленне з аўтарэфератам дысертацыі Панова С. В. дазваляе сцвярджаць, што яна з’яўляецца самастойна выкананым арыгінальным гісторыка-педагагічным даследаваннем, якое сведчыць аб асабістым укладзе саіскальніка ў тэорыю і практыку школьнай гістарычнай адукацыі.

Дысертацыйнае даследаванне Панова С. В. «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» адпавядае навуковай кваліфікацыі доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі.

Доктар гістарычных навук, прафесар
кафедры гісторыі Беларусі і
славянскіх народаў БДПУ А.П. Жытко

...снік начальніка АК БДПУ